**9 (62)**
**верасень**

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

*Пасведчанне*
*аб рэгістрацыі*
*№ 411*
*ад 28 чэрвеня 1996 г.*

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

**НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС**

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь,**
**Інстытут гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі,**
**Беларускі дзяржаўны універсітэт,**
**Беларускае таварыства «Веды»**

***Рэдакцыйная калегія:***

*Галоўны рэдактар Васіль Кушнер*

**Сымон Барыс** (рэдактар аддзела), **Уладзімір Бажанаў, Пётр Брыгадзін, Валерый Галубовіч, Максім Гальпяровіч** (адказны сакратар), **Аляксандр Гужалоўскі, Пятро Драчоў** (мастацкі рэдактар), **Віктар Іўчанкаў, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Кошалеў, Аляксандр Лакотка, Наталля Матусевіч** (намеснік галоўнага рэдактара), **Уладзімір Міхнюк**, **Алег Слука, Мікалай Сташкевіч, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Сяргей Ходзін, Васіль Шайкоў, Захар Шыбека, Алег Яноўскі**.

***Рэдакцыйная рада:***

**Уладзімір Адамушка, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Андрэй Гарбацкі, Уладзімір Гілеп, Анатоль Грыцкевіч, Андрэй Каракін, Аляксандр Каханоўскі, Веньямін Космач, Іван Крэнь, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Барыс Ляпешка, Аляксей Літвін, Павел Лойка, Леанід Лойка, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Святлана Марозава, Ян Мілеўскі, Антон Мірановіч, Уладзімір Навіцкі, Міхась Піліпенка, Якаў Рыер, Вячаслаў Селяменеў, Віталь Скалабан, Аляксандр Смолік, Мікалай Смяховіч, Мечыслаў Часноўскі, Анатоль Шаркоў, Эдмунд Ярмусік.**

## ЗМЕСТ

**ДА 60-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ І ПЕРАМОГІ САВЕЦКАГА НАРОДА Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ**

Леанід Шчамялёў — **"Я прайшоў па той вайне..."** *(запісаў Барыс Крэпак) (с. 2 вокладкі, 47—48, с. 2, 3 уклейкі)*

**ПАЛІТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ**

Уладзімір Ладысеў — **Аб'яднанне беларускай нацыі** *(да 65-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР)* — 3

Вольга Рабышка — **Этнапалітычны фактар у беларуска-польска-літоўска-расійскіх адносінах у 1919—1921 гг.** — 14

**УСЕАГУЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ**

Дзмітрый Шаўрук — **Тайваньская праблема як перашкода ў кітайска-амерыканскіх адносінах** — 19

**ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ**

Юрый Грыбоўскі — **Польскія вайскоўцы беларускага паходжання ў савецкім палоне** (1939—1945 гг.) — 23

**ПАДАРОЖЖА ПА ДАЎНЯЙ БЕЛАРУСІ**

**Вітаўт Чаропка** **Магілёў** 34

**ГІСТОРЫЯ АДУКАЦЫІ**

**Пётр Дзмітрачкоў** **Адзін са старэйшых гістарычных факультэтаў ВНУ рэспублікі** 38

**Васіль Шайкоў** **Вучыцца "на гісторыка" трэба ў Полацку** 45

**САЦЫЯЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ**

**Наталля Палятаева** **Змяненне структуры купецкіх сем'яў Беларусі** (70-я гг. XIX—пачатак XX ст.) 49

**ІМЁНЫ ВЯДОМЫЯ І НЕВЯДОМЫЯ**

**Васіль Кушнер** **Стваральнік канцэпцыі беларускай нацыянальнай гісторыі** 53

**МЕТОДЫКА. ВОПЫТ**

**Наталля Кулакова** **Крызіс прыгонніцкай сістэмы ў Беларусі** (канец XVIII—50-я гады XIX ст.) *(VIII клас)* 60

**Наталля Ілюкевіч** **Вайна ў Еўропе ў 1939—1941 гг.** *(IX клас)* 64

**Леанід Ісачкін** **Заданні для школьных алімпіяд у старшых класах** 68

**Наталля Шаблоўская** **З гісторыі культурных раслін** *(X клас)* 72

**Содержание** 79

**Summary** 80



***Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, вул. Ленінградская, 14, пакой 707;***
***220072, Мінск, вул. Акадэмічная, 1, пакой 401. Тэлефоны: (017) 209-54-63, 284-27-00.***
**e-mail: aiv@aiv.by; http:/aiv.by; bhc@aiv.by**
**факс: 284-27-00**
**Установа «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне».**

Падпісана да друку 2.09.2004 г. Афсетны друк. Фармат $60x84^1/_8$. Ум. друк. арк. 9,3. Ул.-выд. арк. 11.
Наклад 2078 асобнікаў. Зак. 1250.
*Надрукавана ў друкарні РУП «Прамдрук». Ліцэнзія № 02330/0148775 ад 30.04.2004 г.*
*220049, г. Мінск, вул. Чарняхоўскага, 3.*


**Да ведама аўтараў!**

**За дакладнасць прыведзеных у артыкулах фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў. Навуковыя артыкулы прымаюцца да разгляду з рэкамендацыяй кафедры (аддзела) вучэбнай або навуковай установы. Рэцэнзаванне арганізоўвае рэдакцыя. Да разгляду прымаюцца рукапісы аб'ёмам не больш як 15 старонак, надрукаваныя ў двух экземплярах (пажадана з дыскетай). Просім у допісах паведамляць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, кароткія звесткі пра сябе, пашпартныя даныя (абавязкова асабісты нумар), дакладны адрас, тэлефон. Рукапісы не вяртаюцца.**

Паважаныя чытачы!

У выпадку паліграфічнага браку просім звяртацца ў друкарню РУП «Прамдрук»; у выпадку, калі хто не атрымае часопіс па падпісцы, просім звяртацца ў паштовае аддзяленне па месцы жыхарства або ў РДА «Белпошта».

УВАГА!
Пераносы некаторых слоў, а таксама некаторыя абазначэнні на замежных мовах зроблены не па правілах граматыкі, а з улікам магчымасцей камп'ютэрнай настольна-выдавецкай сістэмы.


© **«Беларускі гістарычны часопіс», 2004.**

САЦЫЯЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

Наталля ПАЛЯТАЕВА

# Змяненне структуры купецкіх сем'яў Беларусі (70-я гг. XIX—пачатак XX ст.)



ПАЛЯТАЕВА Наталля Іванаўна — дактарант Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзілася ў г. Мінску. Скончыла гістарычны факультэт БДУ (1982), аспірантуру пры БДУ (1986). Працавала асістэнтам, дацэнтам кафедры эканамічнай гісторыі БДЭУ. Займаецца вывучэннем гісторыі купецтва Беларусі ў другой палове XIX—пачатку XX ст. Сааўтар падручнікаў «Эканамічная гісторыя Беларусі», «Экономическая история зарубежных стран». Аўтар каля 30 навуковых публікацый па праблемах эканамічнай гісторыі.

Актуальнасць тэмы артыкула вызначаецца шэрагам фактараў. Па-першае, яна адносіцца да аднаго з важных аспектаў гісторыі прадпрымальніцтва ў Беларусі, бо менавіта сям'я з'яўляецца «жывой «лабараторыяй» чалавечага лёсу, асабістага і народнага, і прытым кожнага народа асобна і ўсіх народаў разам»[1].

Па-другое, у купецкім асяроддзі сям'я адыгрывала вельмі важную эканамічную ролю, таму што яна з'ўлялася галоўнай адзінкай адміністрацыйнага і падатковага ўліку, увасабляла адзіны купецкі капітал, у руках галавы сям'і засяроджваліся ўсе камерцыйныя здзелкі.

Па-трэцяе, у адрозненне ад расійскай гістарыяграфіі, дзе эвалюцыя купецкіх сем'яў стала прадметам спецыяльнага аналізу[2], беларускія даследчыкі амаль што не звярталіся да гісторыка-дэмаграфічных праблем[3]. Як выключэнне можна назваць манаграфію А.Р.Яшчанкі, у якой характарызуюцца сем'і жыхароў Гомеля другой паловы XIX—пачатку XX ст.[4].

У прапануемым артыкуле аналізуюцца працэсы, якія адбываліся ў купецкіх сем'ях Беларусі, высвятляецца іх узаемасувязь з сацыяльна-эканамічным развіццём беларускіх зямель. Крыніцамі статыстычных даных сталі матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі і НГАБ у Гродна, а менавіта спісы купцоў па губернях, гарадах і паветах. Яны знаходзяцца ў фондах гарадскіх упраў, казённых палат, падатковых інспектараў, гарадскіх і павятовых паліцэйскіх упраўленняў, гарадскіх дум.

Найбольш поўна гэтыя дакументы прадстаўлены ў фондзе Мінскай казённай палаты, дзе налічваецца каля 150 падобных спраў за 1863—1907 гг. Захаваліся таксама спісы купцоў Віцебскай губерні. Фонд Віцебскай гарадской управы змяшчае больш за 50 такіх спраў за 1875—1918 гг., у фондзе Віцебскай казённай палаты ёсць даныя не толькі па Віцебску, але і па Суражу, Лепелю, Дрысе, Полацку за 1895, 1912—1918 гг. На жаль, па Магілёўскай губерні аналагічныя матэрыялы прадстаўлены слаба. Захаваліся толькі асобныя спісы па Оршы за 1860—1869 гг.; па Чэрыкаву — за 1886 г.; Горках — за 1874, 1896—1897, 1902 гг.; Мсціславу — за 1882, 1885, 1893—1902, 1912—1917 гг.; Магілёву — за 1914—1916 гг. і Гомелю — за 1916 г. У НГАБ у Гродна захоўваюцца спісы купцоў Гродзенскай губерні за 1897—1914 гг. Падабенства абставін паходжання і зместу запісаў за розныя гады дазваляюць праводзіць параўнанне іх даных, выкарыстоўваць статыстычныя метады гістарычнага даследавання. З вялікай доляй верагоднасці атрыманыя вынікі можна аднесці да ўсяго купецтва беларускіх зямель. Пры разліках аўтарам улічваліся купцы, якія пражывалі ў межах сучаснай тэрыторыі Беларусі.

Паняцці «сям'я» і «домагаспадарка» былі тоеснымі ў вывучаемы перыяд. Яны азначалі сукупнасць блізкіх сваякоў, якія жылі разам і вялі агульную гаспадарку пад кіраўніцтвам аднаго чалавека — гаспадара.

Разгледзім дынаміку колькаснага складу (люднасці) купецкіх сем'яў беларускіх губерняў (табл. 1)[5].

*Табліца 1*

## Колькасны склад (люднасць) купецкіх сем'яў Беларусі (1876—1913 гг.)

| Губерні | | Віцебская* | | | | | | Гродзенская** | | | | Мінская*** | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Гады | | 1876 | 1887 | 1895 | 1900 | 1908 | 1913 | 1897 | 1901 | 1910 | 1913 | 1880 | 1890 | 1898 | 1900 | 1907 | 1913 |
| Усяго чалавек у саслоў'і | | 866 | 1 419 | 2 108 | 1 190 | 1 583 | 2 043 | 1 938 | 1 813 | 1 938 | 2 414 | 435 | 2 378 | 3 100 | 2 495 | 2 429 | 1 742 |
| Колькасць сем'яў | | 122 | 139 | 397 | 207 | 270 | 447 | 330 | 298 | 332 | 640 | 67 | 410 | 608 | 500 | 391 | 290 |
| Сярэдняя люднасць сем'яў (чалавек) | | 7,1 | 10,2 | 5,3 | 5,7 | 5,8 | 4,6 | 5,8 | 6,1 | 5,8 | 3,8 | 6,5 | 5,8 | 5,1 | 5,0 | 6,2 | 6,0 |
| Колькасць чалавек у сям'і (%) | 1 | 4,1 | 5,8 | 4,2 | 7,2 | 10,9 | 14,1 | 4,3 | 5,7 | 6,2 | 12,5 | 1,5 | 4,8 | 6,4 | 7,0 | 6,4 | 5,5 |
| | 2 | 11,6 | 6,7 | 15,6 | 13,4 | 10,9 | 12,3 | 14,1 | 15,7 | 10,8 | 17,1 | 1,9 | 13,6 | 13,8 | 15,9 | 13,5 | 12,1 |
| | 3 | 7,4 | 12,7 | 10,6 | 9,9 | 8,2 | 13,0 | 13,2 | 14,0 | 12,4 | 14,4 | 11,5 | 10,9 | 12,3 | 12,1 | 10,5 | 9,0 |
| | 4 | 7,4 | 10,2 | 12,2 | 12,4 | 12,0 | 15,4 | 15,1 | 17,6 | 13,3 | 13,3 | 13,5 | 12,8 | 15,5 | 13,6 | 13,5 | 19,7 |
| | 5 | 15,7 | 4,2 | 13,3 | 14,1 | 17,6 | 13,9 | 13,9 | 12,0 | 15,8 | 14,8 | 9,6 | 12,0 | 16,6 | 12,6 | 10,7 | 14,8 |
| | 6 | 8,3 | 17,0 | 11,8 | 13,9 | 14,2 | 11,4 | 12,0 | 12,0 | 15,8 | 9,9 | 20,2 | 13,8 | 10,7 | 12,1 | 12,8 | 13,8 |
| | 7 | 9,1 | 14,4 | 10,3 | 7,1 | 6,7 | 6,7 | 9,8 | 8,9 | 5,8 | 2,3 | 9,6 | 12,0 | 6,3 | 9,6 | 11,4 | 7,9 |
| | 8 | 6,6 | 8,5 | 6,1 | 5,9 | 5,6 | 5,1 | 5,5 | 3,4 | 4,9 | 3,0 | 13,5 | 7,1 | 7,5 | 6,8 | 7,5 | 7,9 |
| | 9 | 6,6 | 8,5 | 7,2 | 6,4 | 5,2 | 3,8 | 6,1 | 3,1 | 5,4 | 3,4 | 1,4 | 4,5 | 3,3 | 2,4 | 3,4 | 3,4 |
| | 10 | 6,6 | 1,7 | 4,2 | 4,1 | 2,6 | 1,6 | 1,3 | 2,7 | 1,7 | 1,9 | 1,9 | 3,1 | 1,5 | 2,6 | 3,6 | 2,0 |
| | <10 | 16,6 | 10,3 | 4,5 | 5,6 | 6,1 | 2,7 | 4,7 | 4,9 | 7,9 | 7,4 | 15,4 | 5,4 | 6,1 | 5,3 | 6,7 | 3,9 |

З прыведзеных даных можна зрабіць выснову, што дакладна выяўленай тэндэнцыяй было скарачэнне сярэдняй люднасці купецкіх сем'яў. Калі ў Віцебскай губерні ў сярэдзіне 1870-х гадоў яна складала 7,1 чалавека, а ў сярэдзіне 1880-х гадоў нават 10,2 чалавека, то да 1913 г. люднасць сем'яў купцоў паменшылася да 4,6 чалавека. У Гродзенскай губерні сярэдняя люднасць купецкіх сем'яў скарацілася ў паўтара раза і складала ў канцы XIX ст. 5,8 чалавека, напярэдадні першай сусветнай вайны — 3,8 чалавека. У Мінскай губерні аналагічныя працэсы былі не настолькі відавочныя, тэндэнцыя да скарачэння сярэдняй люднасці сем'яў (у 1,3 раза) мела месца ў 80—90-я гады XIX ст. У пачатку XX ст. гэты паказчык знаходзіўся ў межах 6,0—6,2 чалавека. Гэта можна растлумачыць тым, што ў Мінскай губерні канцэнтравалася старое патомнае купецтва, патрыярхальныя традыцыі ў асяроддзі якога, верагодна, былі яшчэ дастаткова моцныя. Назіраліся даволі значныя ваганні сярэдняй люднасці купецкіх сем'яў у залежнасці ад часу і геаграфічнага становішча рэгіёна. Гэты паказчык залежаў таксама ад веравызнання купцоў: у купцоў-хрысціян ён быў некалькі ніжэйшы, чым у купцоў-іудзеяў. Скарачэнне сярэдняй люднасці сем'яў купцоў-хрысціян пачалося, верагодна, раней, чым у купцоў-іудзеяў, паколькі ўжо ў сярэдзіне 1870-х гадоў гэты паказчык складаў, напрыклад, у Віцебску 5,1 чалавека.

Аднак даных аб сярэдняй люднасці недастаткова для ацэнкі тых працэсаў, якія адбываліся ў купецкіх сем'ях. Таму разгледзім змяненні ў іх колькасным складзе. Звяртае на сябе ўвагу значнае зніжэнне долі сем'яў, якія складаліся больш чым з дзесяці чалавек. У сярэдзіне 1870-х гадоў такіх сем'яў у Віцебскай губерні было 16,6%, у пачатку 1880-х гадоў у Мінскай губерні — 15,4%. Да 1913 г. іх удзельная вага знізілася ў Віцебскай губерні да 2,7%, у Мінскай — да 3,9%, у Гродзенскай — да 7,4%. Найбольшай у пачатку XX ст. была сям'я купца з Бабруйска Ш.Ш.Кацнельсона — 39 чалавек[6].

Прыведзеныя даныя ілюструюць паступовае зніжэнне долі сем'яў у складзе 8—10 чалавек. Павялічвалася доля сем'яў з аднаго і двух чалавек. У цэлым да 1913 г. у беларускіх губернях такія сем'і складалі амаль што пятую частку.

Найбольшая ўдзельная вага ў 1870—1880-я гады прыпадала на сем'і з пяці—шасці чалавек, у 1890-я гады—пачатку XX ст. — з двух, чатырох і пяці чалавек. Такім чынам, вялікіх па памерах сем'яў у купецкім саслоўі становілася менш, прасочвалася тэндэнцыя да перавагі сем'яў, якія складаліся са шлюбнай пары і двух—чатырох дзяцей.

Прычыны такіх змяненняў варта шукаць у комплексе фактараў. Развіццё капіталізму, бясспрэчна, адбілася на эвалюцыі сям'і. Працэс урбанізацыі, распаўсюджванне каштоўнасцей гарадскога ладу жыцця прыводзілі

* У гэтай і наступных табліцах: Віцебская губерня — за 1876, 1887 і 1913 гг. даныя толькі па Віцебску і павету;
** Гродзенская губерня — у графе за 1913 г. — даныя за 1914 г.;
*** Мінская губерня — у 1876 г. — 2 632 чалавекі — 455 сем'яў, сярэдняя люднасць — 5,8 чалавека; за 1880 г. — даныя па Барысаву, Мазыры і паветам; за 1913 г. — па Мінску і павету.

да разумення таго, што малая сям'я ў новых умовах эканамічна больш жыццяздольная, чым вялікая. Варта адзначыць таксама пашырэнне медыцынскіх ведаў, некаторае паляпшэнне аховы здароўя ў гарадах, а галоўнае — даступнасць медыцынскай дапамогі для заможных слаёў насельніцтва, да якіх належала і купецтва. Праяўлялася таксама спецыфіка прадпрымальніцкага асяроддзя, дзе дух індывідуалізму распаўсюджваўся больш шырока, чым, напрыклад, сярод сялянства.

Такія істотныя змены маглі быць выкліканы асаблівасцямі вертыкальных сацыяльных перамяшчэнняў у гарадах. Асноўную масу насельніцтва гарадоў складалі мяшчане. Паводле даных Першага Усеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г., у Еўрапейскай Расіі гарадская сям'я ўключала ў сярэднім 4,3 чалавека[7]. Гэты паказчык можна распаўсюдзіць і на ўсё мяшчанства. Купецтва папаўнялася галоўным чынам за кошт гэтай саслоўнай групы, прычым у пачатку XX ст., паводле даных аўтара, выхадцы з мяшчан сярод купцоў складалі да 87%[8]. У купецкае саслоўе прыўносіліся традыцыі другой сацыяльнай групы (мяшчанства), што ў канчатковым выніку прыводзіла да скарачэння люднасці купецкіх сем'яў.

Змяненне колькаснага складу сем'яў праходзіла за кошт зніжэння нараджальнасці. У цэлым па Еўрапейскай Расіі пачынаючы з 1860-х гадоў нараджальнасць пачала зніжацца паўсюдна, у гарадах хутчэй, чым у сельскай мясцовасці. У саслоўях мяшчан, купцоў колькасць дзяцей ва ўзросце да 7 гадоў у 1860 г. складала 15,6%, у 1903 г. — 15%[9].

Паводле даных расійскага гісторыка Б.М.Міронава, да канца XIX ст. нараджальнасць у яўрэйскіх сем'ях была ніжэйшая, чым у прадстаўнікоў іншых этнасаў, агульная і асабліва дзіцячая смяротнасць у іх знаходзілася на істотна больш нізкім узроўні. Яўрэі ў Расіі адны з першых уступілі ў стадыю дэмаграфічнага пераходу ад традыцыйнага да рацыянальнага тыпу ўзнаўлення насельніцтва[10].

Разгледзім унутраную структуру купецкіх сем'яў. Адпаведна тыпалогіі, агульнапрынятай у сучаснай гістарычнай дэмаграфіі, адрозніваюць пяць форм сямейнай арганізацыі: 1) сям'я, якая складаецца з аднаго чалавека; 2) група сваякоў або несваякоў, якія не ўтвараюць сям'ю, але вядуць агульную гаспадарку; 3) простая малая, або нуклеарная, сям'я, якая ўключае мужа і жонку з нежанатымі дзецьмі; 4) пашыраная сям'я, якая ўключае мужа і жонку з дзецьмі і сваякоў, якія не знаходзяцца адзін з адным у шлюбных адносінах; 5) саставная сям'я, якая складаецца з дзвюх або болей шлюбных пар. У пятую катэгорыю ўваходзяць таксама і так званыя вялікія патрыярхальныя бацькоўскія або брацкія сем'і, якія ўключаюць некалькі пакаленняў аднаго продка, утвараюць 3—5 і болей шлюбных пар і аб'ядноўваюць 15, 20, 30 і болей чалавек[11].

Тыпалогія купецкіх сем'яў паводле ўнутранай структуры прадстаўлена ў табліцы 2.

Аналіз паказвае, што ў купецкім саслоўі ў вывучаемы перыяд простыя сямейныя ячэйкі складалі большасць. Але і тут была свая дынаміка. Калі ў 1870—1880-я гады малых сем'яў было ад 58 да 68% агульнай колькасці

*Табліца 2*

**Тыпалогія купецкіх сем'яў Беларусі (1876—1913 гг.)**[12]

| Губерні | | Віцебская | | | | | | Гродзенская | | | | Мінская | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Гады | | 1876 | 1887 | 1895 | 1900 | 1908 | 1913 | 1897 | 1901 | 1910 | 1913 | 1880 | 1890 | 1898 | 1900 | 1907 | 1913 |
| Тыпы сем'яў, % | 1 | 4,1 | 5,8 | 4,2 | 7,2 | 10,9 | 14,1 | 4,3 | 5,7 | 6,2 | 12,5 | 1,5 | 4,8 | 6,4 | 7,0 | 6,4 | 5,5 |
| | 2 | 0,0 | 1,4 | 0,3 | 0,5 | 0,5 | 0,2 | 0,8 | 1,0 | 0,6 | 0,3 | 1,5 | 0,4 | 1,5 | 2,0 | 1,5 | 0,3 |
| | 3 | 58,2 | 71,3 | 84,9 | 77,3 | 79,7 | 82,3 | 74,1 | 73,8 | 79,7 | 78,8 | 68,6 | 75,4 | 77,1 | 77,4 | 80,6 | 80,1 |
| | 4 | 8,2 | 2.8 | 2,0 | 3,9 | 2,0 | 0,0 | 1,1 | 0,7 | 0,6 | 0,0 | 1,5 | 1,2 | 1,3 | 1,4 | 1,0 | 1,0 |
| | 5 | 29,5 | 18,7 | 8,6 | 11,1 | 6,9 | 3,4 | 19,7 | 18,8 | 12,9 | 8,4 | 26,9 | 18,2 | 13,7 | 12,2 | 10,5 | 13,1 |

Прыгаданыя спісы купцоў дазваляюць высветліць, як змяніўся гэты паказчык у купецтва беларускіх губерняў. Прасочваецца ўстойлівая тэндэнцыя да зніжэння колькасці дзяцей у купецкіх сем'ях. Калі ў сярэдзіне 1870-х гадоў у Віцебскай губерні ўдзельная вага дзяцей ва ўзросце да 9 гадоў складала 25,1%, то да 1908 г. яна скарацілася да 10,6%. Аналагічныя даныя па Мінскай губерні выглядаюць так: 1890-я гады — 17,5 %, 1913 г. — 10,8 %. Звесткі па Гродзенскай губерні яшчэ больш красамоўныя. Доля дзяцей да 9 гадоў у сем'ях купцоў у 1914 г. складала 8,6%. Такая дынаміка можа быць растлумачана, на наш погляд, працэсам урбанізацыі. Каштоўнасці гарадскога ладу жыцця праявіліся ў такім аспекце, як планаванне сям'і. Немалаважным з'яўляецца і той факт, што купецтва Беларусі па нацыянальнаму складу было ў асноўным яўрэйскім — 87,9% у 1897 г. Да пачатку першай сусветнай вайны да 98% саслоўя складалі прадстаўнікі яўрэйскага этнасу. Паводле даных расійскага гісторыка Б.М.Міронава, ...

сем'яў купцоў Віцебскай і Мінскай губерняў, то ў 1913 г. — ад 78% у Гродзенскай губерні да 82% у Віцебскай. Назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя да павелічэння долі нуклеарных сем'яў. Таксама павялічвалася і доля сем'яў з аднаго чалавека. Купец без сям'і часцей за ўсё атрымліваў гільдзейскае пасведчанне на сваё імя ў тым выпадку, калі ён быў удаўцом або яшчэ не знаходзіўся ў шлюбе. У Віцебскай губерні ўдзельная вага такіх сем'яў узрасла з 4,1 да 14,1%, у Гродзенскай губерні — з 4,3 да 12,5%. Доля гэтай групы ў Мінскай губерні ў апошнюю трэць XIX ст. павялічылася з 1,5 да 7,0%, а ў пачатку XX ст. скарацілася да 5,5%.

Пашыраныя сем'і, якія складалі ў сярэдзіне 1870-х гадоў 8% ад агульнай колькасці купецкіх сем'яў, да 1913 г. амаль што цалкам зніклі. Значна менш стала саставных сем'яў. Да канца 1880-х гадоў іх колькасць вагалася ад 18 да 29%. У 1913 г. у Віцебскай губерні яны складалі 3,4%, у Гродзенскай — 8,4%, у Мінскай —

13,1%. Канфесіянальныя асаблівасці выяўляліся ў паскораным пераходзе да простых сем'яў сярод купцоў-хрысціян і больш марудным — сярод купцоў-іудзеяў. Прыведзеныя даныя дазваляюць зрабіць выснову, што ў перыяд капіталізму ў купецкім саслоўі адбываліся працэсы распаду складаных сем'яў і спрашчэння іх структуры. Прычыны гэтага, верагодна, хаваюцца ў спецыфіцы эканамічнай функцыі сям'і. У купцоў сям'я фактычна адпавядала аднаму самастойнаму прадпрымальніку. На эканамічныя магчымасці сям'і рэсурсы фізічнай працы яе членаў амаль што не ўплывалі. Таму працэс спрашчэння арганізацыі сям'і пад уплывам развіцця капіталістычных адносін ішоў у купецкім асяроддзі дастаткова інтэнсіўна.

На жаль, у беларускай гістарыяграфіі адсутнічаюць даныя па іншых саслоўях. Таму выкарыстаем даныя тыпалогіі сем'яў вясковага насельніцтва і гараджан беларускага рэгіёна ў канцы XIX ст. Сярод вясковых жыхароў колькасць адзінокіх складала 2,3%, малых сем'яў (разам з пашыранымі) — 47,7%, састаўных — 50%. У гараджан адпаведна — 5, 62,3 і 32,6%[13]. Як бачна, у канцы XIX ст. працэс распаду састаўных сем'яў і пераходу да малых сем'яў у купецтва ішоў значна хутчэй, чым у сялян, і некалькі хутчэй, чым у гараджан у цэлым. Гэта звязана з тым, што для эканамічнага патэнцыялу купецкай сям'і пераважнае значэнне меў узровень развіцця не вытворчых сіл (напрыклад, фізічных працоўных рэсурсаў сям'і), а вытворчых адносін.

Разам з унутранай структурай дэмаграфічныя працэсы ў купецкім саслоўі ілюструюць змяненні ў пакаленнай структуры сем'яў, зводныя даныя аб якой прадстаўлены у табліцы 3.

*Табліца 3*

**Пакаленная структура купецкіх сем'яў Беларусі 1876—1913 гг. (%)[14]**

| Губерні | | Віцебская | Мінская | Віцебская | Гродзенская* | Мінская | Віцебская | Гродзенская | Мінская |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Гады | | 1876 | 1880 | 1900 | | | 1913 | | |
| Лік пакаленняў | 1 | 14,0 | 1,5 | 17,9 | 20,1 | 21,0 | 23,7 | 15,7 | 18,3 |
| | 2 | 55,7 | 79,1 | 71,9 | 68,5 | 68,8 | 73,2 | 74,4 | 76,9 |
| | 3 | 26,2 | 16,4 | 9,7 | 11,1 | 10,2 | 3,1 | 9,9 | 4,8 |
| | 4 | 4,1 | 3,0 | 0,5 | 0,3 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 |

Аналіз часовых змяненняў у пакаленнай структуры купецкіх сем'яў Беларусі дазваляе зрабіць выснову пра наяўнасць дзвюх узаемадапаўняльных тэндэнцый. З аднаго боку, устойліва павялічвалася доля сем'яў у складзе аднаго і двух пакаленняў. З другога — значна скарачалася колькасць трох- і чатырохпакаленных сем'яў. Прычым доля сем'яў, якія складаліся з чатырох пакаленняў, у даследуемы перыяд была невялікая. Такія сем'і зніклі сярод купецкага саслоўя Мінскай губерні да 1900 г., у Віцебскай і Гродзенскай — да 1907—1910 гг.

Самай шматлікай была група сем'яў, якія фарміраваліся з двух пакаленняў — бацькоў і дзяцей. У Віцебскай губерні доля такіх сем'яў павялічылася з 55,7% у 1876 г. да 73,2% у 1913 г. Аналагічныя змены адбыліся ў Мінскай губерні — 69,8% у 1890 г. і 76,9% у 1913 г., у Гродзенскай губерні — 68,2 % у 1897 г. і 74,4% у 1913 г. Доля аднапакаленных сем'яў у купецкім саслоўі таксама ўзрастала і складала напярэдадні першай сусветнай вайны ад 15,7 у Гродзенскай да 23,7% у Віцебскай губернях.

Канфесіянальныя асаблівасці пакаленнай структуры характарызаваліся тым, што ў купцоў-хрысціян адсутнічалі трох- и чатырохпакаленныя сем'і, некалькі большай — да 30% — была доля аднапакаленных сем'яў.

Такім чынам, пад уплывам развіцця капіталістычных адносін, гарадскога ладу жыцця ў купецкіх сем'ях Беларусі адбываліся працэсы, якія значна змянялі іх структуру. Гэта выяўлялася ў скарачэнні сярэдняй людпасці сем'яў. Калі ў 1870—1880-я гады яна складала 7,1—10,2 чалавека, то ў 1913 г. у сярэднім па Беларусі — 4,8 чалавека. Адбывалася зніжэнне колькасці шматдзетных сем'яў, скарачалася нараджальнасць, што сведчыла пра пераход купецкага саслоўя ад традыцыйнага да рацыянальнага тыпу ўзнаўлення. Адбываўся распад складаных сем'яў, спрашчалася іх унутраная і пакаленная структура. Усе гэтыя з'явы можна расцэньваць як пацвярджэнне паступовай змены дэмаграфічнай мадэлі паводзін купецкага саслоўя Беларусі ў перыяд капіталістычнага развіцця.

* Па Гродзенскай губерні даныя за 1901 г.

[1] Ильин И.А. Путь к очевидности. М., 1993. С.199.

[2] Гончаров Ю.М. Купеческая семья второй половины XIX—начала XX в. (по материалам компьютерной базы данных купеческих семей Западной Сибири). М., 1999; Скубневский В.А., Старцев А.В., Гончаров Ю.М. Купечество Алтая второй половины XIX—начала XX вв. Барнаул, 2001.

[3] Насытка Я.П. Узнаўленне насельніцтва Беларусі ў 1860-я — 1914 гг.: гістарыяграфія праблемы // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. Мн., 2001. С. 148.

[4] Яшчанка А.Р. Этнаканфесійны склад і асаблівасці побыту насельніцтва Гомеля ў другой палове XIX—пачатку XX ст. Мн., 1999.

[5] НГАБ. Ф. 1, воп. 1, спр. 6312; ф. 333, воп. 3, спр. 914, 919; воп. 4, спр. 4554, 4817, 4818, 4819, 4820, 4821, 4946, 6269, 6270, 6271, 6272, 6273, 6274, 6275, 6276, 8870, 9747, 13643; ф. 359, воп. 1, спр. 16; ф. 2496, воп. 1, спр. 1044, 1053, 1090; ф. 2523, воп. 1, спр. 6; ф. 2640, воп. 1, спр. 489, 486, 525, 528, 529, 534, 592; НГАБ у Гродна. Ф. 24, воп. 3, спр. 2149; воп. 5, спр. 433, 434, 1137; ф. 125, воп. 1, спр. 98; ф. 237, воп. 1, спр. 61; ф. 492, воп. 1, спр. 129.

[6] НГАБ. Ф. 333, воп. 4, спр. 13643, арк. 64.

[7] Миронов Б.Н. Социальная история России периода империи (XVIII—начало XX вв.): В 2-х т. Т. 1. СПб., 2000. С. 232.

[8] НГАБ. Ф. 1, воп. 1, спр. 6312, арк. 1—463.

[9] Миронов Б.Н. Социальная история России периода империи (XVIII—начало XX вв.). Т. 1. С. 179—180.

[10] Там жа. С. 208.

[11] Там жа. С. 219—220.

[12] НГАБ. Ф. 1, воп. 1, спр. 6312; ф. 333, воп. 3, спр. 914, 919; воп. 4, спр. 4554, 4817, 4818, 4819, 4820, 4821, 4946, 6269, 6270, 6271, 6272, 6273, 6274, 6275, 6276, 8870, 9747, 13643; ф. 359, воп. 1, спр. 16; ф. 2496, воп. 1, спр. 1044, 1053, 1090; ф. 2523, воп. 1, спр. 6; ф. 2640, воп. 1, спр. 489, 486, 525, 528, 529, 534, 592; НГАБ у Гродна. Ф. 24, воп. 3, спр. 2149; воп. 5, спр. 433, 434, 1137; ф. 125, воп. 1, спр. 98; ф. 237, воп. 1, спр. 61; ф. 492, воп. 1, спр. 129.

[13] Миронов Б.Н. Социальная история России периода империи (XVIII—начало XX вв.). Т. 1. С. 226, 235.

[14] НГАБ. Ф. 1, воп. 1, спр. 6312; ф. 333, воп. 3, спр. 914, 919; воп. 4, спр. 4554, 4817, 4818, 4819, 4820, 4821, 4946, 6269, 6270, 6271, 6272, 6273, 6274, 6275, 6276, 8870, 9747, 13643; ф. 359, воп. 1, спр. 16; ф. 2496, воп. 1, спр. 1044, 1053, 1090; ф. 2523, воп. 1, спр. 6; ф. 2640, воп. 1, спр. 489, 486, 525, 528, 529, 534, 592; НГАБ у Гродна. Ф. 24, воп. 3, спр. 2149; воп. 5, спр. 433, 434, 1137; ф. 125, воп. 1, спр. 98; ф. 237, воп. 1, спр. 61; ф. 492, воп. 1, спр. 129.